До половины шестого уже работают все садики Ленинского и Заводского районов. В Центральном районе такой режим будет в детских садах №№ 109, 116, 118, 150, 187, 213, а в Первомайском районе — №№ 123, 145, 146, 190, 308, 309. Во Фрунзенском районе девять детских садов уже в прошлом году были переведены на более короткий день, к счастью, их список не продолжился. В Партизанском районе во многих ведомственных детских садах уже введен 11-часовой рабочий день. Тогда как в других районах ведомственные сады остаются работать в прежнем 12-часовом режиме. А вот в Советском районе планируют сделать в некоторых садиках часть групп с 10,5-часовым рабочим днем, а часть оставить с 12-часовым. Для того чтобы переход на новый режим был не таким "болезненным", эти вопросы по возможности согласуются с родителями.

Как объяснили в горисполкоме, причиной для введения нового режима в дошкольных учреждениях Минска стал дефицит городского бюджета. Прежде чем принять подобное решение, горфинуправление проехало с инспекцией по минским детским садам. Было установлено, что после пяти часов во многих садиках уже почти не остается детей, и воспитатели должны "отсиживать" оставшееся время, а это дополнительные затраты электроэнергии. Поэтому и будет введен в некоторых детских садах новый режим.

Анна ЗАЙЦЕВА.

Здарэнні

Шчасце, што не загінулі дзеці

Добра яшчэ, што начная аўтааварыя, якая здарылася ў Калінкавіцкім раёне, абышлася без ахвяр і ніхто сур'ёзна не пацярпеў. Як паведаміў карэспандэнту БелТА апаратыўны дзяжурны МУС Уладзімір Забудзька, пяцярым дзецям, якія атрымалі нязначныя траўмы, аказана медыцынская дапамога без шпіталізацыі. Здарылася гэта так: у 3.30 ночы 26 жніўня аўтобус, які вез 28 мінскіх дзяцей, а яны вярталіся дамоў пасля адпачынку ў Балгарыі, перакуліўся ў кювет. На месца аварыі неадкладна прыбылі медработнікі і супрацоўнікі міліцыі, якія прынялі ўсе меры па ліквідацыі яе вынікаў. Устаноўлена, што дарожна-транспартнае здарэнне адбылося па віне вадзіцеля, які не справіўся з кіраваннем аўтобуса. Хоць на гэты раз усё абышлося, але і такі факт разам з трагедыяй у Кобрынскім раёне, калі загінулі дзеці, якія ехалі на адпачынак за мяжу, вельмі насцярожвае. Бяспека на дарогах, забеспячэння якой настойліва патрабуе ад супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі прэзідэнт рэспублікі, вымушае жадаць лепшага.

Сяргей ЦІВАНАЎ, БелТА.

...Не да кіно

Сёлетняй восенню пабачыць свет чарговы "Каталог беларускіх фільмаў" за 1994-1996 гады. У ім на трыццаці шасці старонках будуць прадстаўлены работы айчынных дзяржаўных, незалежных і прыватных кінастудый.

У мінулым годзе беларускія кінематаграфісты знялі шэсць мастацкіх стужак. Няшмат, але што зробіш, калі час не спрыяльны для кінатворчасці. У гэтым годзе, напрыклад, знялі пакуль што толькі два фільмы, хутка будзе завершана трэцяя кінастужка.

Ларыса ПЯТРОВА.

Трывожна!

"Пераможаны" ГКЧП працягвае сваё шэсце...

У тыя дні жніўня 1991 года адбылася палітычная падзея, якая па сваіх рухаючых сілах, па форме засталася нераскрытай таямніцай. Яе наступствы атрымалі парадаксальны эфект і дадалі нямала зігзагаў ходу нашай гісторыі.

Мінулы час умацаваў упэўненасць у тым, што абедзве асобныя трактоўкі путча (як дзяржаўнага перавароту, або, з другога боку, — "народна-дэмакратычнай рэвалюцыі") не з'яўляюцца дакладнымі. Жнівень-91 не быў рубіконам паміж распачатай зверху перабудовай і перыядам "дэмакратычных рэформаў", а стаў драматычным звязуючым звяном. Згадаем рэаліі таго часу: так, ліквідаваны СССР, але працэсы, што адбываюцца на постсаюзнай прасторы з канца 1993 года, падводзяць да высновы аб пэўным з а м к н ё н ы м к о л е. І найбольш характэрны прыклад "траекторыі вяртання" — дзеянні ўладаў на Беларусі.

Знайсці адказы на пытанні аб станаўленні наменклатурна-аўтарытарнага рэжыму дапаможа аналіз у больш шырокім кантэксце.

"Андропаўскі праект"

У сярэдзіне 70-х гадоў аналітычныя групы ЦК КПСС і КДБ на чале з Ю.Андропавым пры набліжэнні крызісу і агоніі савецкай сістэмы завяршылі распрацоўку праекта па выхаду з складанейшага становішча. Ён прадугледжваў **абмен улады на ўласнасць** — пераўтварэнне наменклатуры з феадальна-бюракратычнага саслоўя ў буржуазна-бюракратычны клас; пераход ад планава-каманднай эканомікі да рынкава-манапольнай; замену постсталінскай таталітарнай сістэмы на аўтарытарную дзяржаўнасць. У выніку прапаноўвалася трансфармацыя збанкрутаваўшага камунізму ў аўтарытарна-манапалістычны капіталізм.

Тут узгадваецца не столькі перадышка-нэп, колькі саракапяцігадовай даўніны спроба Берыі знізіць ролю Кампартыі на карысць рэпрэсіўнай бюракратычнай алігархіі пры асцярожным адкрыцці СССР знешняму свету. З 1978 года камуністычнае кіраўніцтва Кітая паспяхова павяло аўтарытарную мадэрнізацыю праз дынамічны дзяржапарат і слой прадпрымальнікаў пад наглядам партыйнай эліты. Меркавалася, што і В.Ярузэльскі ў Польшчы, і Я.Кадар у Венгрыі будуць рабіць падобнае.

Механізм змены кадраў прадугледжваў знаходжанне шчыліны ўнутры артадаксальнага кіраўніцтва рэспублікі, рэгіёна, пошук кампраментуючых сувязей. І пад лозунгамі барацьбы з карупцыяй і злоўжываннямі ўлады ставіліся "железные малыши" з пітомніка КДБ — супрацоўнікі міліцыі, КДБ, маладыя тэхнакраты ці партыйцы. Схема паліцэйскага перавароту была паспяхова выпрабавана ў 1969 годзе ў Азербайджане (Г.Аліеў), у 1972 годзе ў Грузіі (Э.Шэварднадзе) і працягвала рэалізоўвацца — "падкапвалі" пад сярэднеазіяцкіх і маскоўскіх саноўнікаў. Нават умяшанне Брэжнева ў абарону сваіх сваякоў не спыніла ажыццяўлення задуманага плана.

1983, андропаўскі, год — не проста час навядзення "дысцыпліны і парадку" з аблавамі ў лазнях, кінатэатрах і антыдысідэнцкіх рэпрэсій. Змясціла акцэнты афіцыйная ідэалогія: выкарыстоўваліся югаслаўская мадэль "сацыялістычнага самакіравання", самастойнасць прадпрыемстваў і тэхнакратычнага апарату. Так рыхтавалася ўвядзенне "к і р у е м а г а р ы н к у". Узмоцненыя карныя органы вялі барацьбу з карупцыяй супраць мясцовых груповак брэжнеўскай партбюракратыі, прайшоў шэраг паказальных працэсаў.

У Маскве пад патранажам Андропава збіралася наменклатурная кагорта — Гарбачоў, Рыжкоў, Лігачоў, Варатнікоў, Шэварднадзе, Якаўлеў, якім прадстаяла рэалізоўваць задуманае. І фарсавая альтэрнатыва ў асобе Чарненкі толькі ўпэўніла іх у неабходнасці працягу "аздараўлення" савецкага ладу.

Непераможныя ідэі Андропава

1985—1986 гады ішлі пад знакам п а с к а р э н н я па-андропаўскі: вялізныя інвестыцыі ў машынабудаванне (ВПК), кадравая чыстка, антыалкагольная кампанія, пераслед "аматараў непрацоўных даходаў". Узорным стандартам быў рэжым Хонэкера ў ГДР. Аднак з 1987 года п е р а с т р о й к а з яе ідэалагічнымі паслабленнямі, галоснасцю, абяцаннямі палітычнай рэформы выклікала ўнутрыпартыйныя разборкі, супраціўленне старых кадраў з абкамаў і міністэрстваў. Абвастраліся праблемы з рэсурсамі, эканамічныя цяжкасці. І ўсё гэта пры ваенна-стратэгічным ціску заходніх краін. Спадкаемцы "Генсека КДБ" на XXVIII з'ездзе КПСС былі адсунутыя рэвізіяністамі, якіх падтрымаў Гарбачоў. З 1989 года перабудова ўсё больш атрымоўвала ўласную дынаміку, адаляючыся ад "кропкі вяртання".

Пад канец 1990 года Гарбачоў адкінуў размовы пра цэнтрызм, атрымаў суперпрэзідэнцкія паўнамоцтвы, распачаў рэпрэсіі супраць "так званых дэмакратаў" і рэспубліканскіх эліт, што імкнуліся да незалежнасці. Аднак ні указы прэзідэнта СССР аб адмене рашэнняў кіраўніцтва рэспублік, ні ўтварэнне там паралельных прафсаюзных структур, ні тактыка развязвання спецслужбамі лакальных канфліктаў на тэрыторыі саюзных рэспублік не далі плёну. Апошняя фармальная спроба захаваць СССР — нова-агароўскі працэс па заключэнню 20 жніўня 1991 года Дагавора аб Саюзе Сувярэнных Дзяржаў. Але 19 жніўня ў 6 гадзін раніцы па радыё прагучала аб'ява аб надзвычайным становішчы.

ЧП крэмлёўскага маштабу

"Квазіпутч", "недапераварот", здзейснены ГКЧП, выглядаў сапраўды абсурдным і выклікае падазрэнні ў яго імітацыі. Арганізатараў путча ў непадрыхтаванасці, непрафесіяналізме не западозрыш. Той жа шэф КДБ Кручкоў асабіста падрыхтоўваў паспяховыя перавароты ў 1981 годзе ў Польшчы і ў некаторых іншых краінах.

Вышэй згаданая эвалюцыя савецкай улады дазваляе даць наступныя тлумачэнні акцый тых дзён. Гарбачоў не вельмі верыў з сярэдзіны 1991 года ў поспех саюзна-дагаворнага працэса, і яму хутчэй за ўсё былі вядомыя "новыя старыя" напрацоўкі кіраўнікоў асноўных структур Цэнтра. Як чалавек нясмелы, з клопатам аб сваёй гістарычнай місіі, ён ухіліўся ад актыўнай ролі ў гэтай гульні. А згуляць, у тым ліку за яго, збіраліся саюзны ўрад на падмурку ВПК, сілавых міністэрстваў, арміі, а таксама эшалон вышэйшай наменклатуры з часткі рэгіёнаў. Меркавалася напужаць Ельцына, а таксама і нацыянальных, радыкальна-дэмакратычных лідэраў. Па логіцы путчыстаў, за пераваротам павінны былі адбыцца перамовы, кампраміс і ўтварэнне новага ўрада СССР. Гэта падцвярджаецца зместам прэс-канферэнцый ГКЧП увечары 19 жніўня. Путчысты заявілі, што збіраюцца дамовіцца з Ельцыным, а Гарбачоў пасля навядзення парадку вернецца да ўлады, у эканамічнай галіне не будзе вялікіх зменаў. Але ў хунце яшчэ раней адбыўся раскол, нехта здаў казырныя карты Ельцыну. І пакуль хунта імітавала пераварот, Ельцын парушыў правілы гульні, хутка павялічыў баланс сіл на сваю карысць і справакаваў супраціўнікаў на першую кроў. Цікава, што путчысты збеглі да Гарбачова ў Крым, дзе і былі арыштаваныя.

Моцны ўрад утварыўся, але не саюзны, а ельцынскі, расійскі, без артадаксальных камуністаў. Інтэлектуалы спецслужбаў у Крэмлі ўказалі тады, што магчымы толькі кіруемы распад СССР і затым аднаўленне новага Саюзу.

Беларусь: "звычайны путчызм"

Акрамя расійскай і прыбалтыйскай рэспублік, ва ўсіх астатніх рэспубліканскае кіраўніцтва ў той ці іншай ступені путч падтрымала. Каб гульня ў Маскве зацягнулася яшчэ на пару дзён, мы б даведаліся больш пра мясцовых "герояў". На Беларусі КПБ і з меншым імпэтам — Прэзідыум Вярхоўнага Савета і ФПБ — калабарацыяністцкі спрыялі сваімі заявамі рэалізацыі загадаў ГКЧП. Зварот КПБ быў прыняты па некаторым дадзеным (Путч. Хроника тревожных дней. М., "Прогресс", 1991, с. 204) пасля вяртання першага сакратара КПБ А.Малафеева з Масквы, дзе ён знаходзіўся апошнія два дні. Беларускі КДБ не выканаў шыфраграму Кручкова ад 19 жніўня і ў сярэдзіне 20 жніўня на Прэзідыуме Вярхоўнага Савета не змяніў сваёй пазіцыі. Але зусім па-іншаму справы пайшлі ў канцы дня. Вось якія тлумачэнні даваў пазней старшыня КДБ Э.Шыркоўскі: *"Мне пазваніў сакратар ЦК КПБ Ціхіня і сказаў, што ад Бюро ЦК рыхтуецца зварот да працоўных рэспублікі .., але я ўпэўнена заяўляю — з яго слоў не ўгледзеў, што дакумент накіраваны на падтрымку ГКЧП"* ("7 дней" ад 21—27 кастрычніка 1991 года). Шкада, што беларускі шэф КДБ "не ўбачыў" сэнсу ў ацэнках Звароту КПБ *"вымушанага характару прадпрынятых мер па навядзенню парадку ў краіне"* і ў закліку *"праявіць вытрымку"*.

Пазней ў Вярхоўным Савеце адбыліся вядомыя падзеі: прыпыненне дзейнасці КПБ — КПСС, замена Дземянцея на Шушкевіча, утварэнне часовай камісіі па ацэнцы дзеянняў ГКЧП на Беларусі. Рэспубліканская наменклатура пайшла на абвяшчэнне суверэнітэту не столькі пад ціскам дэмакратычнай апазіцыі, БНФ, колькі для блакіравання рэфарматарскіх памкненняў новага ўраду Расіі. З незачыненых партыйных рахункаў грошы былі перапампаваны ў камерцыйныя структуры. Цікавыя закладаліся "кропкі росту". Так, дэпутацкая група "Камуністы за дэмакратыю" папрасіла зарэгістраваць яе як "Фракцыю дэмакратычных рэформаў" і звярнулася да першасных камуністычных арганізацый з заклікам утварыць рэспубліканскую партыю "За дэмакратычныя рэформы і развіццё". Адзін з актывістаў групы — на той час дэпутат Вярхоўнага Савета А.Лукашэнка — пракаментаваў гэта рашэнне так: *"Агонію кампартыі я, яе "шэраговы член", адчуваў даўно. Для таго, каб аздаравіць сітуацыю, выратаваць усіх здаровамыслячых камуністаў.., намі планіравалася ўтварыць паралельныя структуры* (словы з вядомага лексікону — І.Р.) *унутры самой партыі. З роспускам КПСС-КПБ такая неабходнасць адпадае"* ("Знамя юности" ад 27 жніўня 1991 года). Як пісаў тады палітолаг Л.Лойка: "бюракратыя распалася ў новых умовах на партапарат і дзяржаўных чыноўнікаў, партыя (а можа, і дзве) паўстане новая. Сацыяльная база ў тых, хто трымае у сваіх руках дзяржаўную ўласнасць, заўсёды знойдзецца".

Праз наменклатурную дыктатуру да імперыі

Ужо ў сярэдзіне 1992 года ў Расіі, а ў Беларусі яшчэ раней, наменклатура вярнула эканамічную магутнасць на псеўдарынкавай аснове і аднавіла палітычныя пазіцыі ў органах улады. Пачаліся жорсткія скаардынаваныя акцыі гвалту ў СНД па тактыцы органаў Кручкова — Пугі ўзору 1990—1991 гадоў. Прыднястроўе, Нагорны Карабах, Крым — і м п е р с к і я а н к л а в ы, дзе дасюль рыхтуецца база для ўсталявання дыктатуры патрэбнага тыпу. У іншых краінах СНД нацыянальных радыкалаў змянілі знаёмыя асобы — Г.Аліеў, Э.Шэварднадзе. На апошняга, калі ён паспрабаваў адысці ў бок, вынайшлі абхазкую дубіну. І калі ў страчанай для імперыі Прыбалтыцы прыйшлося распускаць інтэрфранты, спецыяльныя структуры, дык у сярэднеазіяцкіх рэспубліках, у Арменіі правілы гульні выконваюцца.

На беларускім прыкладзе прасочым далейшыя працэсы. Наменклатура (дзяржапарат і дырэктарат, куды пераціклі прагматычныя партыйцы) пад слабеючую камуністычную рыторыку ўвайшла ў паразітычны перыяд першаснага накаплення. Пад млявым кіраўніцтвам Шушкевіча ішло станаўленне стыхійнага наменклатурнага капіталізму. Але сістэмны крызіс зацягваўся, наспявалі раздзяржаўленне і прыватызацыя, збядненне выклікала незадавальненне людзей. Пасля цвёрдалобай і няўдалай спробы аўтарытарнага вырашэння падобных праблем у Маскве ў кастрычніку 1993 года на Беларусі пайшлі па больш "акуратнаму" і выпрабаванаму шляху. "Барацьба з карупцыяй", з адасобіўшыміся рэгіянальнымі кланамі вынесла на паверх новага дзеяча, вельмі падобнага на "железного малыша". Яго куміры, пра якіх ён распавядаў у перадвыбарчых інтэрв'ю, сімвалічныя — Дзяржынскі, Андропаў, Машэраў.

На Беларусі стаў ажыццяўляцца пераход да **наменклатурнай дыктатуры**, пабудаванай на жорсткай іерархіі з рэгламентаваным доступам да ўласнасці. З усімі рамантыкамі развіталіся, а тых, хто падобна Ціхіні, не выконвалі дамоўленасцяў, "папрасілі". І зноў выйшлі наперад А.Малафееў і яму падобныя.

Зроблены саюз чатырох рэспублік, рыхтуецца інтэграцыйны рэферэндум у Арменіі, набліжаецца чырвоны штурм для змены рэшткаў ельцынскіх рэфарматараў у цэнтры адноўленай імперыі. "Пераможаны" ГКЧП працягвае сваё шэсце.

Ігар РЫНКЕВІЧ, гісторык.

Народная Воля
29 ЖНІЎНЯ 1997 г.

Дайджест

На Западе люди тоже строят себе коттеджи, но — для отдыха

Канадская газета "Торонто Сан" посвящает статью национальной гордости русских — садово-огородным участкам, или попросту дачам. Политические перевороты, смены правительства и даже экзотические курорты на берегу Средиземного моря не смогут убить в русском человеке любовь к своей даче. В чем секрет этой любви, корреспондент газеты открыть так и не смог. На Западе люди тоже строят себе коттеджи, но не для разведения садово-огородных плантаций, как русские, а для отдыха. Но, что еще более не понятно автору статьи, так это пристрастие к дачным участкам "новых русских". Побывав на нескольких дачах "новых русских", корреспондент "Торонто Сан" пришел к выводу о том, что и российские нувориши верны национальным традициям. По его мнению, шикарные многоэтажные коттеджи с бассейнами и подземными гаражами — это не что иное, как хорошо замаскированные дачи с парниками и грядками.

Полицейские Скотланд-Ярда нелегально зарабатывают десятки тысяч фунтов стерлингов

Сенсационный материал публикует на своих страницах британская газета "Санди Таймс". Полицейские Скотланд-Ярда нелегально зарабатывают десятки тысяч фунтов стерлингов частным сыском. Используя свое служебное положение, они без особых проблем устанавливают подслушивающие устройства, а за значительную сумму могут продать интересующую вас информацию из национальной компьютерной базы британской полиции. Газета также отмечает, что Скотланд-Ярду уже стали известны имена нескольких "находчивых" полицейских. Возможно, что уже на этой неделе все они на время расследования будут отстранены от своих должностей.

Подготовила Светлана РОСТОВА

Украина

Леонид Кучма ждет от членов нового правительства Украины не личной преданности, а "осмысленной работы" по реализации реформ

Руководитель Украины Леонид Кучма не ждет от членов вновь сформированного правительства страны "личной преданности президенту". Перед Кабинетом министров стоят "жесткие требования". "В повестке дня — предметная и осмысленная работа по реализации концепции реформ", — подчеркнул глава государства, выступая на днях в Мариинском дворце в Киеве на официальной церемонии представления — впервые в истории страны — нового состава Кабинета министров.

"Сегодня вы фактически приносите присягу народу Украины", — заявил Л.Кучма, обращаясь к членам кабинета. Тем самым, по его мнению, процесс формирования и функционирования Кабинета министров становится "прозрачным".

Представление правительства не должно быть воспринято как "дань внешней парадности", заявил президент. Он уверен, что это событие послужит "конкретным, практическим и прагматическим целям".

Л.Кучма дал поручение министру информации ввести рубрики на телевидении и радио о работе правительства.

Члены правительства, по замечанию главы государства, — люди разные, с разными политическими взглядами, но "политические взгляды надо оставить за порогом правительственного здания". По словам Л.Кучмы, он хотел бы, чтобы в новом правительстве была создана "атмосфера деловитости".

В составе нового украинского Кабинета 25 министров:

Первый вице-премьер Анатолий Голубченко; вице-премьер по социальной политике, министр труда и социальной политики Николай Белоблоцкий; вице-премьер Валерий Смолий; вице-премьер по вопросам экономики Сергей Тигипко, а также министры: Кабинета министров — Анатолий Толстоухов; промышленной политики — Василий Гуреев; по делам семьи и молодежи — Валентина Довженко; образования — Михаил Згуровский; по вопросам чрезвычайных ситуаций и по защите населения от последствий чернобыльской катастрофы — Валерий Кальченко; АПК — Юрий Карасик; охраны окружающей среды и ядерной безопасности Украины — Юрий Костенко; внутренних дел — Юрий Кравченко; обороны — Александр Кузьмук; информации — Зиновий Кулик; финансов — Игорь Митюков; внешнеэкономических связей и торговли — Сергей Осыка; культуры — Дмитрий Остапенко; по делам науки и технологий — Владимир Семиноженко; охраны здоровья — Андрей Сердюк; юстиции — Сюзанна Станик; экономики — Виктор Суслов; иностранных дел — Геннадий Удовенко; транспорта — Валерий Череп; энергетики — Алексей Шеберстов; угольной промышленности — Станислав Янко.

Республика Таджикистан

Таджикистан ожидает от ООН "более активных действий" по афганскому урегулированию

Таджикистан ожидает от ООН "серьезных и более активных действий" по урегулированию ситуации в Афганистане. Об этом президент Эмомали Рахмонов заявил на недавней встрече в Душанбе со специальным посланником Генерального секретаря ООН по Афганистану Ладхаром Брахими, сообщил "Интерфаксу" пресс-секретарь главы таджикского государства Зафар Саидов.

Э.Рахмонов вновь высказался за созыв международного форума по Афганистану под эгидой ООН с участием всех противоборствующих афганских сторон, сопредельных с Афганистаном государств, а также России и США.

По словам президента, у Таджикистана, "пережившего ужасы гражданской войны, видимо, больше, чем у других, оснований и морального права требовать скорейшего урегулирования афганской проблемы".

"Таджикистан выступает за такое решение афганской проблемы, которое устроило бы подавляющее большинство афганцев, независимо от их этнической принадлежности, политических взглядов, регионального происхождения и т.д.", — подчеркнул Э.Рахмонов.

"Мирный и единый Афганистан" не только отвечал бы национальным интересам Таджикистана, но и стал бы важным элементом системы безопасности в Центральной Азии, убежден таджикский лидер.

Достижение мира в Афганистане, продолжал он, позволит транснациональным корпорациям реализовать крупные нефтяные и газовые проекты в регионе. В свою очередь центральноазиатские государства с переходной экономикой получат возможность для развития торгово-экономического сотрудничества на региональном и глобальном уровнях. Кроме того, стабильность в регионе позволит этим государствам укрепить свою независимость, ускорить движение к демократии и рыночной экономике, убежден таджикский лидер.

Грузия

Грузия и Абхазия пока не готовы перейти к широкомасштабному экономическому сотрудничеству

Государственный министр Грузии Нико Лекишвили положительно расценил итоги состоявшихся в Сухуми грузино-абхазских переговоров по экономическим вопросам.

На пресс-конференции в Тбилиси он сообщил, что на них, в частности, обсуждались вопросы, связанные с эксплуатацией расположенной на территории Абхазии Ингури-ГЭС. По всем этим вопросам, по словам министра, были достигнуты позитивные договоренности.

Вместе с тем Н.Лекишвили подчеркнул, что ни Тбилиси, ни Сухуми пока не готовы перейти к широкомасштабному экономическому сотрудничеству. Он заявил, что налаживание подобного сотрудничества напрямую связано с решением ряда политических вопросов. "Невозможно идти на сближение слишком большими шагами, так как за решением одного вопроса тут же встанут другие", — заметил госминистр.

Говоря о возможности создания в Абхазии свободной экономической зоны, Н.Лекишвили заявил, что считает этот шаг неоправданным. По его словам, "Грузия является не такой большой страной, чтобы позволить себе иметь свободные экономические зоны".

Узбекистан

Ислам Каримов высоко оценивает пуск в строй крупнейшего в стране НПЗ

Президент Ислам Каримов считает, что с пуском в строй Бухарского нефтеперерабатывающего завода — одного из самых крупных нефтяных проектов, осуществленных в Узбекистане и Центральной Азии — республика "не только полностью обеспечит себя нефтепродуктами, но и начнет их экспортировать".

Об этом глава государства заявил на днях на торжественной церемонии ввода в эксплуатацию первой очереди НПЗ в поселке Караулбазар Бухарской области.

Как передает корреспондент "Интерфакса", в церемонии приняли участие делегации Франции, Японии, США и других государств, фирмы и компании которых возводили и финансировали Бухарский НПЗ, а также представители дипломатического корпуса.

И.Каримов особенно подчеркнул, что завод будет работать на сырье, получаемом на Кокдумалакском нефтегазоконденсатном месторождении. Там около двух месяцев назад была сдана в эксплуатацию компрессорная станция, позволившая увеличить добычу газоконденсата с 25% до 70%.

Как сообщили "ИФ" в национальной корпорации "Узбекнефтегаз", строительство Бухарского НПЗ осуществлялось совместно с консорциумом Technip (Франция) — Marubeni (Япония) — JVC (Япония) с мая 1995 года на условиях "под ключ".

Проектная мощность предприятия — 5 млн. тонн нефти и газоконденсата в год. Сейчас вошла в строй первая очередь. Завод будет ежегодно перерабатывать 2,5 млн. тонн конденсата с получением 660 тыс. тонн бензина, 1330 тыс. тонн дизтоплива. Стоимость технологической части проекта составляет $262 млн.

К сведению. По оценкам экспертов, общие запасы нефти в Кокдумалакском месторождении составляют более 98 млн. тонн (хотя извлекаемые — почти в два раза меньше). Запасы конденсата — 96 млн. тонн, а газа — около 143 млн. тонн.

Финансирование проекта велось как из правительственных источников, так и за счет кредитов Европейского банка реконструкции и развития, а также Всемирного банка.

В корпорации "Узбекнефтегаз" "ИФ" сообщили, что Бухарский НПЗ и Кокдумалакское месторождение связаны построенным в конце 1995 года конденсатопроводом пропускной способностью в 2,5 млн. тонн и протяженностью в 94 км.

Старонкі гісторыі

Крывавы след Мураўёва-вешальніка і грамадзянскі патрыятызм Юзафа Монтвілы і яго ідэйных паплечнікаў

Пасля разгрому паўстання 1863 года грамадска-культурнае жыццё ў беларуска-літоўскім краі замерла. Мураўёў-"вешальнік" і ягоныя паплечнікі імкнуліся знішчыць усе культурныя, гаспадарчыя і палітычныя традыцыі беларуска-літоўскіх зямель, каб ператварыць іх у звычайную расійскую правінцыю. Беларускі даследчык Аляксандр Цвікевіч так характарызаваў становішча: "Побач з выпіскай з цэнтральнай Расіі паліцэйскіх, вураднікаў, велікарускіх папоў і цэлае процьмы "істинно-русского" чынавенства, разам з захаваннем у краі ваеннага палажэньня і грамады войск, пачалося "насаждение" на Беларусі расійскае школы, кнігі і прэсы".

У грамадстве Беларусі і Літвы запанавалі настроі расчаравання і апатыі. Многім здавалася, што няма такой сілы, якая б здолела супрацьстаяць гвалту і здзекам велікарускіх "апрычнікаў" і іх прыслужнікаў з ліку мясцовага насельніцтва. Аднак людзі не здаліся на волю лёсу. Змаганне за свабоду і незалежнасць набыло новыя формы. У 70—80-ыя гады рамантычна-паўстанцкі настрой саступіў месца настрою больш рэалістычнаму. Наступіла эпоха пазітывізму, з яго больш прагматычным падыходам да вырашэння нацыянальных, палітычных і іншых праблем. Грамадскім ідэалам стала ўзбагачэнне. Лічылася, што кожная асоба, якая разбагацела, робіць багацейшай і мацнейшай усю нацыю. Ідэолагі пазітывізму (А.Свентахоўскі, Э.Ажэшка, Х.Сянкевіч і інш.) услаўлялі ўжо не смерць за Радзіму, а адкрыццё фабрыкі, майстэрні, касы ўзаемадапамогі, сельскагаспадарчага гуртка, народнай школы, бібліятэкі і г.д.

Гэтым пераменам спрыяла і хуткае развіццё гаспадаркі краю. На працягу апошняй трэці XIX стагоддзя ва ўсіх галінах эканомікі Беларусі і Літвы запанаваў капіталістычны спосаб вытворчасці.

Пастулова ўзнік слой багатых палякаў-прадпрымальнікаў, якія стварылі буйныя капіталы ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, унутранага і знешняга гандлю. Звычайна гэта былі палякі мясцовага (беларускага або літоўскага) паходжання, якія ўласную свядомасць характарызавалі наступным чынам: "Паляк — па нацыянальнасці, ліцвін — па паходжанню". Іх прыналежнасць да польскай культуры спалучалася з усведамленнем беларуска-літоўскага краю як сваёй Радзімы. І многія з іх аказалі сур'ёзную падтрымку польскаму культурнаму руху на Беларусі і Літве. Гэтым людзям і прысвячаецца артыкул.

Некаторыя польскія даследчыкі пачатак XX стагоддзя ў гісторыі Вільні назвалі "эпохай Монтвіла". Юзаф Монтвіл (1850—1911) быў адным з заснавальнікаў, а потым дырэктарам Віленскага зямельнага банка. З першых дзён ягонага існавання (1885) Ю.Монтвіл і кіраўніцтва банка выкарыстоўвалі ўсе магчымасці дзеля абароны польскага і каталіцкага землеўладання. У першую чаргу гэтай справе служыла сістэма крэдытавання. У выпадку банкруцтва палякаў і католікаў рабілася ўсё магчымае, каб зямля не перайшла ў рукі рускіх памешчыкаў і чыноўнікаў. Пры гэтым банк быў гатовы нават несці пэўныя страты. Вось як ацаніў дзейнасць Віленскага зямельнага банка карэспандэнт "Московских ведомостей": "Віленскі зямельны банк прымае пад заклад выключна польскія маёнткі. Ён трымае ў сваіх руках усе зямельныя багацці дзевяці заходніх губерняў і стаіць на стражы польскіх інтарэсаў краю. На банк нельга глядзець, як на камерцыйнае прадпрыемства. Ён з'яўляецца самай буйной палітычнай сілай у краі, і галоўная ягоная задача — захаваць польскія маёнткі ў польскіх руках".

Трэба адзначыць асабістае фундатарства "першага" віленскага банкіра. Ю.Монтвіл быў фундатарам польскага музычнага таварыства "Лютня" (1905). У гісторыю польскай музычнай культуры віленская "Лютня" ўвайшла як пачатковая школа многіх вядомых музыкантаў. Дзякуючы фундатарству Ю.Монтвіла, у Вільні дзейнічалі Школа рамёстваў, Таварыства апекі над дзецьмі, Школа малюнку і некалькі дзіцячых прытулкаў. Усе гэтыя ўстановы адначасова былі тайнымі польскімі школамі.

Ю.Монтвіл меў велізарны аўтарытэт сярод польскай грамадскасці Вільні. Адносіны з ім падтрымлівалі нават польскія сацыялісты, як, напрыклад, Ян Пілсудскі. І гэта пры тым, што кансерватыўныя погляды віленскага банкіра былі добра вядомыя. Край ужо абляцела фраза Ю.Монтвіла: "Хто не быў сацыялістам да 25 гадоў, той не мае сэрца. А хто застаўся ім пасля 25 гадоў — не мае розуму". Агульная праца на карысць нацыянальна-культурнага Адраджэння аб'ядноўвала людзей з рознымі палітычнымі пазіцыямі. І прыкладаў гэтаму мы маем шмат.

Губернскі маршалак шляхты граф Адам Браэль-Плятэр хаваў у сваім доме ад паліцыі дзеячаў Польскай сацыялістычнай партыі (ППС). Дэпутат Дзяржаўнага савета Іпаліт Корвін-Мілеўскі (1848—1932) дапамог баевіку ППС Чэславу Свірскаму, калі той шукаў сховішча пасля нападу на паштовы цягнік. Вядомы ва ўсім краі і за ягонымі межамі публіцыст і палітык схаваў Ч.Свірскага ва ўласным доме. А потым знайшоў для яго аддзенне, грошы, новыя дакументы і білет на цягнік. У 1907 годзе І.Корвін-Мілеўскі выкарыстаў усе свае сувязі, каб не дапусціць высылкі ў Сібір віленскага біскупа Эдварда Ропа. Гэтае заступніцтва заслугоўвае ўвагі, бо яшчэ на пачатку 1906 года І.Корвін-Мілеўскі публічна жорстка крытыкаваў грамадска-палітычную дзейнасць біскупа. Ён літаральна падверг знішчэнню напісаную біскупам праграму Канстытуцыйна-Каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (ККП). Праз год гэта не перашкодзіла кінуцца на выратаванне Э.Ропа.

І.Корвін-Мілеўскі быў галоўным фундатарам будаўніцтва гмаху польскага тэатра ў Вільні. Інкогніта ён заснаваў дзве стыпендыі для студэнтаў-віленцаў, якія вучыліся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта.

Адна з найбагацейшых віленскіх арыстакратак Мечыслава Еленьска, візіт да якой абавязкова наносіў кожны новы губернатар, вяртаючыся з Царства Польскага, звычайна везлі ў сваёй карэце забароненую польскую патрыятычную літаратуру.

Тайную школу, у якой вучылася каля 100 (!) дзетак, стварыў ва ўласным маёнтку яшчэ адзін з дырэктароў Віленскага зямельнага банка Эдмунд Барткевіч. А па ініцыятыве дырэктара Віленскага гандлёвага банка Кароля Сальмановіча ўсе сябры Шляхецкага клуба плацілі падатак на падтрымку тайных польскіх школ на Віленшчыне. У клубе дзейнічала непісанае правіла — на патрэбы тайнай адукацыі перадаваліся ўсе выйгрышы ад гульні ў брыдж і інш. Зачастую гэта былі значныя сумы.

Абаронцам нацыянальна-культурных традыцый на Міншчыне стаў прадстаўнік старажытнага беларускага роду Эдвард Вайніловіч (1847—1928). Для Мінска і Слуцкага павета канец XIX — пачатак XX стагоддзя ў пэўным сэнсе быў "часам Вайніловіча". Суддзя павятовага суда, заснавальнік Мінскага сельскагаспадарчага таварыства, дэпутат Дзяржаўнага савета Э.Вайніловіч мацней за іншых усведамляў Беларусь як сваю Радзіму. Ён падтрымліваў сувязі з дзеячамі беларускага руху, і, магчыма, толькі сацыяльны радыкалізм апошняга перашкодзіў далучэнню да яго Э.Вайніловіча.

У значнай меры дзякуючы Э.Вайніловічу, сучасную плошчу Незалежнасці беларускай сталіцы ўпрыгожвае касцёл святых Сымона і Алены. У канцы XIX стагоддзя ў Мінску заставаўся толькі адзін вялікі каталіцкі храм, што было яўна недастаткова. Католікі-мінчане неаднаразова звярталіся да расійскіх уладаў з просьбай дазволіць будаўніцтва яшчэ аднаго храма. Дазвол быў дадзены толькі ў сакавіку 1905 года. А ў 1910 годзе касцёл быў ужо асвячоны. Такія хуткія тэмпы былі забяспечаны грашыма Э.Вайніловіча. Ён фінансаваў узвядзенне касцёльнага гмаху і стварэнне часткі інтэр'еру. Аздобіць касцёл таксама дапамаглі сродкі мінскіх парафіян (1500 руб.), графа Э.Чапскага (1000 руб.) і інш. Сям'я Скірмунтаў з Парэчча Пінскага павета перадала касцёлу старажытны абраз Маці Божай.

Э.Вайніловіч быў старшынёю Таварыства дабрачыннасці ў Слуцку. У гэтым горадзе, дзякуючы ягоным намаганням, адчыніла дзверы гандлёвая школа. Будынак для яе быў узведзены за кошт слуцкага фундатара. На ягоныя грошы быў узведзены інтэрнат для 60 самых бедных вучняў Слуцкай гімназіі.

Дырэктар Тэхнічнага дэпартамента ў Міністэрстве фінансаў, "правая рука" самога Сяргея Вітэ, Леанард Іваноўскі кіраваў акцыяй дапамогі палітзняволеным з Віленшчыны. Гэты тайны саветнік заснаваў ва ўласным маёнтку нелегальную сельскагаспадарчую школу для дзяцей сялян.

Баляслаў Ялавецкі, сябра Савета па справах чыгункі пры Міністэрстве шляхоў зносін, адзін з кіраўнікоў буйнейшых металургічных і чыгуначных сіндыкатаў на тэрыторыі Расіі, чалавек, які нёс асабістую адказнасць за ўсе чыгуначныя пераезды імператара і ягонай сям'і, падтрымліваў апазіцыйны хрысціянска-дэмакратычны рух на Беларусі і Літве. Менавіта ў ягонай асобе віленскі біскуп Э.Роп знайшоў моцную падтрымку сваёй ініцыятыве па ўтварэнню ККП.

Адчуваючы сябе не толькі палякам, але ў першую чаргу грамадзянінам краю, Б.Ялавецкі фінансаваў выданне ў Пецярбургу літоўскай газеты "Lietuviskas lejkrastis". Іншы "грамадзянін краю" Раман Скірмунт фінансава падтрымаў выданне "Нашай Нівы".

Актыўна спрыяў польскаму культурнаму Адраджэнню адзін з самых папулярных і багатых маскоўскіх адвакатаў, ураджэнец Мінска Аляксандр Лядніцкі (1866—1934). Праз утворанае ў 1893 годзе Рымска-каталіцкае таварыства дабрачыннасці ён дапамагаў палітзняволеным з Беларусі. Пры ягонай фінансавай падтрымцы ў сталіцы Расійскай імперыі былі створаны такія арганізацыі, як музычны клуб "Лютня", Саюз польскіх сокалаў, Саюз польскіх жанчын, Польскі дом і інш. А.Лядніцкі прычыніўся да арганізацыі святкавання ў Маскве 100-годдзя нараджэння Адама Міцкевіча (1898), юбілея Х.Сянкевіча (1900). Ён перадаў значную суму ў грамадскі фонд забеспячэння старасці пісьменніцы Марыі Канапніцкай.

Сярод віленскіх рамеснікаў актыўна дзейнічаў малады прадпрымальнік Зыгмунт Нагродскі (1865—1937). Для дзяцей рамеснікаў ён ладзіў літаратурна-музычныя вечарыны. Менавіта ён у самым канцы XIX стагоддзя ўзначаліў сетку тайных школ на Віленшчыне. Уласным коштам З.Нагродскі выдаваў календары для сялян і танныя брашуры з творамі Адама Міцкевіча, Элізы Ажэшкі, Баляслава Пруса і інш.

У 1899 годзе ён стаў уладальнікам аднаго з буйнейшых у Вільні складаў сельскагаспадарчых прыладаў працы. У якасці дадатку да прададзенага тавару ён распаўсюджваў польскую патрыятычную літаратуру і варшаўскія газеты. Тое ж самае рабілі работнікі абутковага складу Касоўскага. Пры ўпакоўцы яны ўкладвалі разам з абуткам польскамоўныя брашуры і ўлёткі. Аналагічныя "падарункі" рабілі прадаўцы крамы моднага адзення Ярашынскага.

Мы пазнаёміліся з рознымі людзьмі. Гэта багатыя прадпрымальнікі, грамадскія і гаспадарчыя дзеячы, чыноўнікі і інш. Усіх іх аб'ядноўвала разуменне неабходнасці падтрымкі нацыянальна-культурнага Адраджэння. Яны не шкадавалі ўласных сродкаў і намаганняў дзеля адкрыцця тайных школ, выдання і распаўсюджвання кніг, заснавання бібліятэк, дапамогі дзеячам культуры і г.д. І не заўсёды галоўную ролю адыгрывалі патрыятычныя матывы. Многія зыходзілі са звычайнага прагматызму. Але гэта быў прагматызм разумных людзей. Яны ведалі, што ўслед за нацыянальна-культурным Адраджэннем прыйдзе Адраджэнне палітычнае. А гэта значыць, што Радзіма верне дзяржаўнасць і незалежнасць, што нарэшце скончыцца час панавання чужынцаў і іх мясцовых халопаў, што да кіравання краінай прыйдуць тыя, для каго галоўнымі будуць інтарэсы роднай зямлі. Не без падстаў многія фундатары разлічвалі заняць у будучай незалежнай дзяржаве кіруючыя пазіцыі.

Веданне гісторыі Польшчы XX стагоддзя дае падставы сцвярджаць, што прагматызм "новых палякаў" апраўдаў сябе. Польшча заваявала свабоду. І не апошнюю ролю ў гэтым адыгралі людзі, якія на пачатку стагоддзя не шкадавалі ўласных сіл, часу і сродкаў, каб падтрымаць культурнае Адраджэнне.

Цікава, ці будзе калі-небудзь напісаны падобны артыкул пра "новых беларусаў" канца XX стагоддзя?

Аляксандр СМАЛЯНЧУК.
Гродна.

Бомбы летят из космоса

Загадочные катастрофы могут происходить в моменты падения метеоритов

Полыхнула яркая вспышка, прокатилась мощная ударная волна, от которой завибрировали стекла даже в отдаленных домах. И только потом у летящего самолета отвалился хвост и из развороченного фюзеляжа в воздух стали выпадать люди...

Так описывают очевидцы трагедию, происшедшую у них прямо на глазах. Эта катастрофа Ан-24, случившаяся не так давно под Черкесском, действительно выглядит очень странно. Что за взрыв переломил самолет прямо в воздухе? Специалисты так и не пришли к единому мнению. Гипотезу, объясняющую и это, и многие другие воздушные происшествия, предложил комиссии "Феномен" кандидат физико-математических наук, ведущий научный сотрудник ЦНИИмаша Российского космического агентства Александр НЕВСКИЙ:

— В настоящее время известно немало таинственных морских и воздушных катастроф, которые как бы бросают вызов современной науке. При этом некоторые ученые делают вид, что "не царское" это дело (и тем более не научное) — разбираться с подобными загадками. А энтузиасты привлекают иногда настолько фантастические гипотезы, что это ведет к дискредитации проблемы.

Между тем одно из разумных объяснений (без всяких пришельцев и эфирных бомб) дает теория электроразрядного взрыва метеоритов, предложенная автором этих строк еще в 1960 году. Дело в том, что метеориты, пролетая через атмосферу Земли, заряжаются до гигантских электрических потенциалов. Возникает пробой — мощный электромагнитный импульс (ЭМИ), вызываемый огромными разрядными токами, который может выводить из строя магнитные компасы, автопилоты, навигационные приборы, электрические цепи, вызывать короткие замыкания, а также искрения в любых замкнутых пространствах (топливных баках), что неизбежно ведет к взрыву.

Другой мощный поражающий фактор — возникающие при пробое ударные волны. Для метеоритов диаметром около двух метров интенсивность ударных волн может быть эквивалентна взрыву 1000 тонн тротила. Для метеоритов диаметром 10 метров электроразрядный взрыв эквивалентен 100 килотоннам, то есть почти не уступает по мощности первой атомной бомбе. Подобные взрывы могут создавать зоны поражения до 100 км в диаметре.

Так как метеориты диаметром до 2 метров падают на Землю примерно 100 раз в год, а диаметром 5—10 метров — 1—5 раз в год, то это явление может представлять заметную угрозу для самолетов и судов.

Попытаемся расшифровать несколько наиболее загадочных авиационных катастроф с позиции предложенной теории. Рассмотрим самый поразительный случай, который произошел 5 декабря 1945 года, когда 19-е авиазвено, состоящее из пяти бомбардировщиков-торпедоносцев типа "Эвенджер", расположенных на авиабазе в Форт-Лондердейл, вылетело в обычный патрульный полет. Самолеты были оборудованы современными по тому времени навигационными и радиоприборами. Через полтора часа от командира звена поступило паническое сообщение о полной потере ориентации и о выходе из строя у всех самолетов навигационного оборудования. Существуют различные версии дальнейших переговоров, но наиболее достоверной считается, что, кроме этого краткого сообщения, других больше не было. Одновременный выход из строя навигационного оборудования может быть объяснен именно электромагнитным импульсом от сверхмощного метеоритного разряда.

